## Справаздача пра дзейнасць за студзень – чэрвень 2023

### Агульная дзейнасць

- Атрымалі **статус дабрачыннай арганізацыі** ў Эстоніі, што дае магчымасць атрымаць падатковыя ільготы ў тым ліку і для тых, каму мы дапамагаем фінансава.
- Атрымалі **статус праваабарончай арганізацыі**, далучыліся да Прынцыпаў дзейнасці беларускіх праваабаронцаў.

БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

## Рэсурсны цэнтр (I)

- У 2023 годзе падрыхтавалі і запусцілі працу **офісу і гасцёўні Рэсурснага цэнтру**, **<u>стварылі сайт</u>**. У канцы года чакаецца запуск больш пашыранай платформы – Віртуальнага рэсурснага цэнтру, дзе будуць размяшчацца прапановы разнастайных магчымасцяў для культурніцкіх дзеячаў.
- У межах дзейнасці Рэсурснага цэнтру Беларуская Рада культуры рэалізуе праграму **ArtPower Belarus** пры фінансавым падтрыманні Еўразвязу: ладзім конкурсы праектавых прапаноў на атрыманне малых і сярэдніх грантаў, а таксама конкурс на падтрыманне мабільнасці.

## Рэсурсны цэнтр (II)

- Падчас першага колу конкурсу зрабілася відавочна, што шмат якія дзеячы культуры маюць патрэбу ў дапамозе і пашырэнні кампетэнцыяў, найперш менеджарскіх: праводзім для іх **кансультацыі ды ментарынгавую дапамогу** ў шэрагу тэмаў.
- Заўважылі ды адзначылі вялікую нястачу прафесійных менеджараў і прадзюсараў у сферы культуры, што асабліва відавочная пасля разгрому галіны ў 2020 годзе і наступнай хвалі эміграцыі. Гэта змусіла нас пачаць рыхтаваць **курс для культменеджараў**. Гэтак, ужо ў 2024 годзе плануем зарганізаваць і правесці некалькі навучальных курсаў. Частка будзе мець публічны характар: напрыклад, шэраг лекцыяў пра актуальныя трэнды ў культуры і творчасці.

# Рэсурсны цэнтр (III)

- Нашыя калегі на практыцы спрабуюць зрэалізаваць інавацыйныя мадэлі падтрымання – напрыклад, Магістраты культуры. Мы запусцілі працу трох **магістратаў**: вакол выдавецтва Андрэя Янушкевіча "**Кнігаўка**", падлеткавага клубу "**Spadčyna-Вроцлаў**", платформы аўтарскіх аўдыяэкскурсіяў па Беларусі, Літве і Польшчы "**ULegend**". Рыхтуем да запуску яшчэ два.
- Беларуская Рада культуры стварае і падтрымлівае сеткавыя кам'юніці дзеячаў культуры, напрыклад, "**Культурны код**" (**нэтўоркінг-група** для беларускіх дзеячаў культуры ды праграмістаў). У межах гэтай супольнасці праходзяць адкрытыя лекцыі, пітчынгі, адбываецца рэкрутынг спецыялістаў у каманды, якія працуюць над стварэннем культурніцка-тэхналагічных стартапаў.

# Рэсурсны цэнтр (IV)

- **Аналітыка і даследаванні культурніцкага поля** – важная частка працы Беларускай Рады культуры.

  У межах гэтай актыўнасці:

  - штоквартал выдаём **аналітычныя матэрыялы** пра стан культуры ў розных яе сферах;
  - рыхтуем да публікацыі даследаванне пра стан культурніцкага поля і арганізацыяў, якія працуюць у сферы культуры;
  - вядзём маніторынг рэпрэсіяў у культуры і сочым за лёсамі рэпрэсаваных творцаў.

## Рэсурсны цэнтр (V)

- Працягваем **персанальна дапамагаць** дзеячам культуры: візамі, юрыдычнымі кансультацыямі, асабістымі зборамі і г. д. Рыхтуем гід пра арганізацыі, што дапамагаюць культурніцкім дзеячам.
- Беларуская Рада культуры стала працуе над пашырэннем **доступу да рэсурсаў** для беларускіх культурніцкіх дзеячаў. Мы правялі два брыфінгі з донарамі. Таксама нам важна прыцягваць спонсарскую дапамогу творцам, творчым праектам і ад беларусаў. У прыватнасці, зладзілі шэраг кансультацыяў наконт стварэння **клубу мецэнатаў** беларускай культуры.

## Сойм

- Створаны маніфест “**Больш чым культура**”, які выказвае нашае бачанне шляхоў развіцця беларускай культуры сёння. Ён стаўся асноваю для распрацоўвання Дарожнай мапы падтрымання культуры.
- Супольна з іншымі культурніцкімі ініцыятывамі і дзеячамі культуры распрацавалі **Дарожную мапу развіцця культуры** і прэзентавалі яе ў Бруселі на SOM 11 траўня 2023 года.
- Спрыяем **стварэнню сетак і кааліцыяў дзеячаў культуры**. Гэтак, у першай палове 2023 года дапамаглі зарганізаваць некалькі ўстановачных сесій для ўтварэння новых суполак.

## Кірунак культурніцкай дыпламатыі і міжнародных стасункаў (I)

- Узялі ўдзел у каардынацыйнай сустрэчы **European Union National Institutes for Culture (EUNIC)** – аб’яднання культурніцкіх інстытутаў Еўропы.
- Сталіся ўдзельнікамі **EU Consultative Group** with representatives of Belarusian civil society and democratic forces. Першая сустрэча групы адбылася ў Бруселі 29 чэрвеня 2023 года.
- Стала супрацоўнічаем з Дацкім інстытутам культуры і NDF Даніі ў межах супольнага праекту пяці краінаў рэгіёну “Усходняга партнёрства”. У 2023-м пачалі працу над праектам, прысвечаным праблемам культурніцкай **дэкаланізацыі рэгіёну**. У яго межах рыхтуем семінар з удзелам армянскіх дзеячаў культуры, даследаванне і ўоркшоп (у канцы 2023-га).

## Кірунак культурніцкай дыпламатыі і міжнародных стасункаў (II)

- Апроч гэтага, у межах працы ў кірунку культурніцкай дыпламатыі запусцілі кампанію **#art_born_Belarus**. Падрыхтавалі **аргументацыю** пра беларускае паходжанне шэрагу славутых мастакоў і мастацкіх твораў. Гэта Восіп Цадкін, Марк Шагал, Хаім Суцін, Фэрдынанд Рушчыц, Ян Хруцкі, Надзея Хадасевіч-Лежэ, Слуцкія паясы, Пітэр Блюм.

**Цягам апошняга паўгода Беларуская Рада культуры ўзяла актыўны ўдзел у шэрагу міжнародных канферэнцыяў і важных сустрэчаў, гэта ў прыватнасці (I):**

- **II Канферэнцыя беларусаў свету** (кіраўнік арганізацыі Сяргей Будкін выступіў падчас панэлі пра культуру);
- праектавая сесія **семінару Аб’яднанага пераходнага кабінету** “Беларускае адраджэнне: шлях ад мінулага да будучыні”;

**Цягам апошняга паўгода Беларуская Рада культуры ўзяла актыўны ўдзел у шэрагу міжнародных канферэнцыяў і важных сустрэчаў, гэта ў прыватнасці (II):**

- канферэнцыя **Civil society organizations and political parties in Belarus** and the countries of the Lublin Triangle and the military situation in Eastern Europe;
- донарская канферэнцыя **Investing in democratic Belarus' long-term future:** identifying best practices to support (праводзілі панэль пра культуру);
- канферэнцыя **"Незалежнае кнігавыдаўніцтва Беларусі:** выклікі і магчымасці".

БЕЛАРУСКАЯ РАДА
КУЛЬТУРЫ

**Беларуская Рада культуры па-ранейшаму дапамагае каардынаваць важныя падзеі і праекты, шукае для іх рэсурсы (I):**

- дапамаглі зарганізаваць і знайсці фінансаванне для святкавання **Дня Волі** ў Коўне;
- дзякуючы інстытуцыйнаму падтрыманню ад ArtPower Belarus для Беларускага моладзевага хабу ў Варшаве і фонду Tutaka праходзяць **Дні беларускай культуры – 2023** пад агульным слоганам **#SpeakBelarus**;
- далучыліся да **Акцыі салідарнасці з палітвязнямі**, падрыхтавалі інфаграфіку пра рэпрэсіі супраць дзеячаў культуры ды правялі вечарыну, прысвечаную Алесю Пушкіну;

БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

**Беларуская Рада культуры па-ранейшаму дапамагае каардынаваць важныя падзеі і праекты, шукае для іх рэсурсы (ІІ):**

- супольна з Марыяй Колесавай-Гудзілінай вядзём працу, каб Закон аб абмежаванні выключных правоў на аб'екты **інтэлектуальнай уласнасці** прызналі злачынным, вядзём перамовы пра выключэнне Беларусі з Сусветнай арганізацыі аховы інтэлектуальнай уласнасці;
- Беларуская Рада культуры – партнёр у праекце "**Васьміног**", у нашай сферы нашай адказнасці – інфармацыйны парадак праекту, а таксама ўдзел у вызначэнні яго стратэгіі; зарганізавалі прэзентацыю праекту, стварылі сайт, нарошчваем сацыяльныя сеткі.

## ArtPower Belarus (I)

**Вынікі першага колу:**

- **16 мідзі-грантаў** падтрымалі на **439 241 еўра**;
- **6 міні-грантаў** на суму **25 521 еўра**;
- **9 мабільнасцяў** на **20 245 еўраў**.

Правялі **Stakeholder Meeting** з еўрадэлегацыяй і палітычнымі структурамі.

Працуем з донарамі, каб прасунуць яшчэ некалькі праектаў на падтрыманне. Дадаткова атрымалі падтрыманне на 2 праекты.

## ArtPower Belarus (II)

**Аналітыка другога колу:**

- **Міні-гранты ArtPower Belarus.** За перыяд з 16.03.2023 да 13.06.2023 прынятыя да разгляду – **93 заяўкі**.
- **Праграма мабільнасці ArtPower Belarus.** За перыяд з 29.03.2023 да 13.06.2023 прынятыя да разгляду – **17 заявак**.

# ArtPower Belarus (I) – міні-гранты



# ArtPower Belarus (I) – міні-гранты

## Наяўнасць у камандах людзей у Беларусі




**Бюджэт**

Агульны:
417 841 EUR

Сярэдні запрошаны:
4 493 EUR

# ArtPower Belarus (II) – праграма мабільнасці




БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

# ArtPower Belarus (II) – праграма мабільнасці

## Наяўнасць у камандах людзей у Беларусі




**Бюджэт**

Агульны:
53 495 EUR

Сярэдні запрошаны:
3 147 EUR